УДК 378.147:811.161.3’243

**Л. С. Кныш** (Мінск)

# ПАРТРЭТ ЧАЛАВЕКА: НЕКАТОРЫЯ ФРАГМЕНТЫ ЎРОКА
## (пры вывучэнні беларускай мовы як замежнай)

Адной з тэм, якая вывучаецца з замежнымі студэнтамі (у прыватнасці з кітайскімі), з’яўляецца партрэтная характарыстыка чалавека. Яна карэлюе з такімі тэмамі, як “Мая сяброўка”, “Мой сябар”, “Мая сям’я”, “Знешні выгляд чалавека” і іншымі і ўваходзіць істотным складнікам у гэтыя тэмы. Ды і ўвогуле з’яўляецца важнай пры засваенні актыўнай лексікі і мовы ў цэлым. Таму пры вывучэнні гэтай тэмы можна вылучыць некалькі асноўных этапаў, якія паспрыяюць глыбокаму засваенню матэрыялу.

І. Лексіка. Яе семантызацыя можа быць рознай, у прыватнасці, як прэзентацыя з малюнкамі-партрэтамі (ніжэй некаторыя з іх як прыклад).

| | | | |
|---|---|---|---|
|  | Галава 头<br>Твар 脸<br>Лоб 前额<br>Скура 皮肤<br>Падбароддзе 下巴 |  | Барада 胡子 |
|  | Брыво, бровы 眉毛<br>Вока, вочы 眼睛<br>Зрэнка, зрэнкі 瞳孔 |  | Язык 舌头 |
|  | Рот 口，嘴<br>Нос 鼻子<br>Пераноссе 鼻梁<br>Вусны, губы 嘴唇 |  | Вяснушкі 雀斑 |

| | | | |
|---|---|---|---|
|  | Вейка, вейкі 睫毛<br>Павека, павекі 眼皮 |  | Зубы 牙齿 |
|  | Вуха, вушы 耳朵 |  | Радзімка 胎痣 |
|  | Скронь 太阳穴<br>Шчака 脸颊 |  | Зморшчынка 皱纹 |
|  | Валасы 头发<br>Скула 颧骨<br>Сківаца 颌骨 |  | Чэрап 颅骨 |
|  | Лысіна, плеш 秃顶 |  | Патыліца 后脑勺子<br>Шыя 脖子 |
|  | Бакенбарды 颊须 | | |

II. Праца з мэтай даць рознабаковую характарыстыку паняццям, напрыклад:

**твар**

а) па форме: шырокі, прадаўгаваты, круглы;

б) па колеры скуры: бледны, румяны, смуглы, загарэлы;

в) па адментых прыкметах: у зморшчынках, у вяснушках, з плямамі, з радзімкамі;

**валасы**

а) па даўжыні: кароткія, доўгія, да плячэй;

б) па аб’ёме: рэдкія, густыя, пушыстыя;

в) па колеры: светлыя, чорныя, белыя, каштанавыя, рудыя, пафарбаваныя, натуральныя;

г) па форме: прамыя, кучаравыя, хвалістыя;

**лоб**

а) па памеры: высокі, нізкі;

б) па ступені адкрытасці: закрыты, адкрыты;

**вочы**

а) па форме: маленькія, вялікія, вузкія;

б) па колеры: шэрыя, карыя, чорныя, блакітныя, зялёныя;

в) па адлюстраванні эмацыянальнага стану: сумныя, вясёлыя, радасныя, хітрыя;

**вейкі**

а) па даўжыні: доўгія, кароткія;

б) па аб'ёме: густыя, рэдкія;

в) па форме: прамыя, загнутыя;

г) па наяўнасці макіяжу: нафарбаваныя, ненафарбаваныя;

**бровы**

а) па даўжыні: доўгія, кароткія;

б) па шырыні: тонкія, вузкія, шырокія;

в) па аб'ёме: рэдкія, густыя;

г) па форме: выгнутыя, роўныя (прамыя);

д) па наяўнасці макіяжу: нафарбаваныя, ненафарбаваныя;

**шчокі**

а) па форме: пухлыя, упалыя;

б) па колеры: ружовыя, румяныя, бледныя;

**нос**

а) па форме: доўгі, прамы, кірпаты, з гарбінкай, бульбінай;

б) па памеры: вялікі, малы;

**вусны**

а) па форме: пухлыя, тонкія;

б) па наяўнасці макіяжу: нафарбаваныя, ненафарбаваныя;

**падбародак** плоскі, з ямачкай, востры, мужны;

**вушы** вялікія, маленькія, аддапыраныя;

**вусы** (у мужчыны)

а) па даўжыні: доўгія, кароткія;

б) па аб'ёме: густыя, рэдкія;

в) па форме: прамыя, закручаныя;

г) па колеры: чорныя, рудыя, светлыя, сівыя;

**барада** (у мужчыны)

а) па даўжыні: доўгая, кароткая;

б) па аб'ёме: густая, рэдкая;

в) па колеры: чорная, рудая, сівая;

**шыя** кароткая, доўгая, "лебядзіная".

**зубы** роўныя, крывыя, прыгожыя, белыя.

III. Заданні рознага тыпу па тэме, скіраваныя на выбар неабходнага слова, на апісанне партрэта па малюнках, на замацаванне матэрыялу ў цэлым, напрыклад.

Заданне 1. Устаўце замест кропак прапушчаныя словы.

1. У маёй сяброўкі … кучаравыя валасы, … нос, … вушы.
2. У майго бацькі … вусы, … лоб, … нос, … твар.
3. У майго дзядулі … вочы, … бровы, … нос, … шчокі, … барада.
4. У яго … лоб, … валасы, … зубы, … вушы, ён не вельмі прыгожы.
5. У яе доўгія … валасы, … вусны, … зубы, … вочы, … вейкі, … бровы, яна проста прыгажуня.

## Знаёмімся з мімікай. Міміка: базавыя варыянты



**Міміка – гэта выраз твару, пры якім чалавек перадае свае пачуцці, настрой.**

Заданне 2. Пранумаруйце малюнкі-маскі, адкажыце на пытанні:

1. Які малюнак-маска перадае здзіўленне?
2. Які малюнак-маска перадае сум, смутак?
3. Які малюнак-маска перадае гнеў?
4. Які малюнак-маска перадае агіду, непрыемнасць?
5. Які малюнак-маска перадае радасць?
6. Які малюнак-маска перадае спалоханасць, нечаканасць, жах.

Заданне 3. Складзіце апісанне па малюнках.

1 
2 
3 
4 
5 
6 
7 
8 

IV. Дыялогі. Праца з дыялогамі.

Прачытайце дыялогі па ролях, знайдзіце апісанне партрэтнай храктарыстыкі і падкрэсліце яго ў тэксце.

Дыялог 1

– О!!! Прывітанне, Аліна!!! Ты такая прыгожая. Не разумею. Што не так? Што змянілася?

– Вітаю, Кастусь. Я ўчора пафарбавала валасы ў светлы колер. Вось і ўсё.

– Так, так. Цяпер бачу. Табе вельмі пасуюць светлыя валасы. І яркі макіяж таксама табе вельмі пасуе. Ну, проста прыгажуня!

– Дзякуй! Шчыры дзякуй!

– Дык, можа, Аліна, сходзім у кіно?

– Ну, што ж, можна і ў кіно.

Дыялог 2

– Вітаю, Ван!

– Прывітанне, Алесь.

– Ці ведаеш ты вунь тую дзяўчыну? Яна мне вельмі спадабалася. Хачу пазнаёміцца.

– Якая дзяўчына? Тая брунетка, з прычоскай карэ і з чырвонай памадай?

– Не, тая, што побач. У яе белыя валасы, вялікія блакітныя вочы, доўгія пушыстыя вейкі, маленькі носік і пухныя вусны. Яна такая прыгожая!

– Дык гэта ж мая аднакласніца Аліна. Я вас пазнаёмлю. Абавязкова.

– Дзякуй табе. Я такі шчаслівы!

Дыялог 3

– Макс! Я сёння быў у краме і бачыў тваю маці. Я заўважыў, што ты да яе зусім не падобны. У яе цёмныя прамыя валасы, кірпаты нос, шэрыя вочы. Яна невысокая, зграбная.

– Так. Я выліты бацька. Як дзве кроплі вады. Так кажа мая маці. Ты ж бачыш, у мяне светлыя валасы, чорныя вочы, нос прамы, вушы вялікія і нават радзімка на правай шчацэ, як у бацькі. А ты да каго падобны? Я ж не ведаю тваіх бацькоў.

– Я? Я падобны да матулі. Усё ўзяў ад яе: і кучаравыя светлыя валасы, і блакітныя вочы, і маленькія вусны, і ямачкі на шчоках, а таксама вяснушкі на носе. А бацька ў мяне грузін. Ад яго, як бачыш, нічога… Затое мая сястра ўся пайшла ў бацькаву радню. І з аблічча, і характарам.

– Як цікава. А нашы дзеці? Да каго будуць падобныя яны?

– Пажывём, пабачым…

**<u>Запомні!!!</u>**
**Падобны да бацькі**
**Падабная да маці**
**Падобныя як дзве кроплі вады**

Заданне 4. Задайце пытанні адзін аднаму паводле ўзору.

У з о р

1. – Я падобны да свайго дзядулі. А ты да каго падобны?
   – …
2. – Мая малодшая сястра падобная да маці. А твой брат да каго падобны?
   – …
3. – Ты падобны да бацькі?
   – Не, я …

Заданне 5. Складзіце свой дыялог на ўзор прачытаных.

Заданне 6. Працягніце дыялог. Дайце поўнае апісанне (ці адметнае), па якім Алесь зможа пазнаць Алену на чыгуначным вакзале.

– Прывітанне, Алесь!

– Вітаю, Макс!

– У мяне да цябе вялікая просьба. Ты не мог бы сёння а 5-й гадзіне сустрэць маю сястру Алену на чыгуначным вакзале? Бо я ў гэты час буду на занятках. У нас будзе кантрольны тэст па граматыцы.

– Вядома, сустрэну. У гэты час я вольны, але як я яе пазнаю?

– О! Алена…

V. Тэкст. Для засваення тэмы можна прапанаваць тэкст, напрыклад “Мая сястра Ніна”.

*Мяне завуць Ліза. А гэта мая старэйшая сястра Ніна. Яна не падобная да мяне, бо ў яе блакітныя вочы і доўгія светлыя валасы. А ў мяне зялёныя вочы, кароткія чорныя валасы, маленькія вушы і пухлыя вусны. У Ніны прыемны свежы колер твару, прыгожыя маленькія вусны, праўда, трэба сказаць, што зрок у яе не вельмі добры. Яна носіць акуляры. Але яны яе не псуюць. Мая сястра стройная і зграбная. У яе добрая фігура. Ніна заўсёды элегантная і выглядае асабліва прывабна, калі ідзе з сябрамі ў кіно або ў тэатр.*

*Ніна вывучае замежныя мовы ва ўніверсітэце. Яна вучыцца на пятым курсе. Летам яна працавала ў турыстычным агенцтве. Яна выдатна ведае французскую і італьянскую мовы. Зараз вывучае польскую. Ніна любіць вандраваць. Яна ўжо пабывала ў Парыжы, Лондане, Бостане, Пекіне, Варшаве, Маскве і іншых гарадах.*

*Ніна любіць дасціпны гумар і жарты. Яна заўсёды мяне падбадзёрвае, бо я не так аптымістычна ўспрымаю жыццё. А яшчэ Ніна кемлівая, прыгожая і вясёлая. Яе ж сябар Васіль, наадварот, маўклівы і спакойны. У яго каштанавыя валасы, абаяльная ўсмешка і карыя вочы. Ён любіць спорт і шмат чытае. Фігура ў яго зграбная і натрэніраваная. Ён высокі і спартыўны. Ніна часта кпіць з яго, але ён ніколі не крыўдуе на яе.*

Заданні да тэксту

- Прачытайце ўважліва, знайдзіце апісанне знешнасці герояў, падкрэсліце.
- Чым адрозніваюцца сёстры Ліза і Ніна? Прачытайце.
- Апішыце Васіля. Які ён?

Заданне 7. Апішыце каго-небудзь са сваёй групы (аўдыторыі).

VI. Дамашняе заданне. Складзіце падрабязнае апісанне знешнасці (партрэтнай характарыстыкі) сябра/сяброўкі; брата/сястры; бацькі/маці або інш.